ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА ПА НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ГОРАДА МАГІЛЁВА



# Паэтычны зборнік

# “Спроба пяра”

Выпуск 2

Магілёў 2020

*Паважаныя сябры!*

*Вы трымаеце ў руках зборнік творчых работ вучняў “Спроба пяра”. У яго ўвайшлі творы конкурсу юных паэтаў, які быў вось ужо другі раз праведзены ўпраўленнем па адукацыі Магілёўскага гарвыканкама, Дзяржаўнай установай па навукова-метадычным забеспячэнні ўстаноў адукацыі горада Магілёва. Конкурс праводзіўся з мэтай выяўлення і падтрымкі таленавітых у галіне літаратурнай творчасці вучняў, развіцця іх творчых здольнасцей, папулярызацыі беларускай мовы і пашырэння сферы яе выкарыстання.*

*Са старонак гэтага зборніка гаворыць з вамі душа маленькіх беларусаў. У сваіх работах вучні стараліся выказаць любоў да сваёй Радзімы, яе прыроды, гісторыі, свайго горада, любоў да роднай мовы, такой прыгожай і пяшчотнай, вобразнай і сакавітай, а таксама прысвячалі вершы гераічным старонкам мінулага Магілёўшчыны, славутым людзям Беларусі. Творы ўражваюць не толькі разнастайнасцю творчых індывідуальнасцей, але, перш за ўсё, свежасцю погляду на жыццё, выразнасцю, вялікай непасрэднасцю і шчырасцю, яны вучаць высакароднасці, выхоўваюць эмоцыі дабрыні.*

*Хочацца выказаць удзячнасць і пераможцам конкурсу, і ўсім тым, хто прыняў у ім удзел. Жыве наша мова і будзе жыць, калі ёсць у нас такія вучні, якія не толькі любяць чытаць па-беларуску, але і самі пачынаюць пісаць на роднай мове.*

*Мы верым, што наперадзе нас чакаюць новыя таленты, новыя эмоцыі і поспехі!*

*У тэкстах захаваны арфаграфія і пунктуацыя аўтараў.*

*Дзяржаўная ўстанова*
*па навукова-метадычным забеспячэнні ўстаноў*
*адукацыі горада Магілёва*

# *Змест*

1. Барыхаў Павел Раманавіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва” ***Мы – беларуская сям’я!***…………………………6
2. Аскірка Алеся Вячаславаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Бусел, Васілёк, Алеся ды Лянок*** ………………..7
3. Бязмен Іна Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Доўга мы зіму чакалі***…………………………….…9
4. Баранкова Дзіяна Андрэеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Памяць аб вайне***...............................................10
5. Грыгор’ева Анастасія Уладзіміраўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Снег на Каляды***………………………11
6. Бабрэнка Цімафей Віктаравіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Віхрам снег кружыцца***…………………………12
7. Траццякова Ганна Аляксандраўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Мая Беларусь***……………………...13
8. Маісеева Дар’я Андрэеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва” ***Родны кут***…………………………………………14
9. Журбенка Лізавета Дзмітрыеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Родная мова***……………………………15
10. Расціянава Дар`я Аляксееўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***У лес***………………………………………………16
11. Атчэская Аляксандра Аляксандраўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Урокі тэатра***………………………...17
12. Шэўчык Міхаіл Аляксеевіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Да людзей***…………………………………………18
13. Васількоў Аляксандр Сяргеевіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Мой Магілёў, любоў мая***…………………………19
14. Карпечанка Мікіта Сяргеевіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва” ***Мая сям’я***………….............................................21
15. Старыкава Марыя Мікалаеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Мой радавод***……………………………………..22
16. Казлоў Раман Уладзіміравіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Дарагія ветэраны!***………………………………23
17. Кузьміна Ксенія Сяргееўна, вучаніца IVкласа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Ты чуеш, гучна льецца слова?***…………………24
18. Папкова Вольга Анатольеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Беларусь***……………………………………..25
19. Панчанкава Варвара Сяргееўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***У госці да бабулі***……………………..26
20. Юрчанка Марыя Паўлаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***На беразе Дняпра***…………………………………27
21. Зайцаў Аляксандр Ільіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Зямля мая***………………………………………28
22. Маменчыкаў Дзяніс Міхайлавіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 8 г. Магілёва” ***Мудрая старасць***..................................................29
23. Рагоўская Анастасія Юр’еўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 9 г. Магілёва” ***Роздум***……………………………………………31
24. Машчынская Анастасія Аляксандраўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Гімн вясне***……………………………32

25. Біндасава Марыя Аляксандраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва” “***Давай пагуляем у вайну…”***…………..33
26. Сітнікава Паліна Андрэеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва” ***Ля магілы невядомага салдата***…………………35
27. Маркава Ганна Уладзіміраўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Мая памяць***……………………………………..36
28. Качанава Ніколь Міхайлаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Родныя словы***…………………………………..38
29. Кучароўская Александрына Андрэеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Найлепшае свята***……………………..39
30. Гузаў Аляксандр Вітальевіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “НПК яслі-сад-сярэдняя школа №44 г.Магілева” ***Дзіцячыя забавы***……………………41
31. Мярзіка Дзмітрый Сяргеевіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа № 42 г. Магілёва” ***Снегавік***………………………42
32. Байкачова Грэта Уладзіміраўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 23 г. Магілёва” ***Фарбы прыроды***……..........................43
33. Рыбакоў Аляксандр Васільевіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва” ***Край беларускі***………......................................44
34. Долбун Арцём Паўлавіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Абуджэнне прыроды***……….................................45
35. Бубнова Паліна Уладзіміраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Мама-педагог***….................................................46
36. Шчадракова Уладзіслава Дзмітрыеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва ***Маё сэрца заўсёды з табою***……………47
37. Лаўрова Паліна Андрэеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 2 г. Магілёва” ***Танец***………………………………………………...48
38. Пухоўскі Яраслаў Дзмітрыевіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Зімовы настрой***…………………………………..49
39. Ключнікава Ангеліна Андрэеўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва” ***Мая радзіма***……………….................50
40. Кавалёў Руслан Дзмітрыевіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Я веру, мова – будзе жыць!***………………………51
41. Лісіцын Мікіта Аляксандравіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Родная мова***……………………………………52
42. Качагарава Арына Алегаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” “***Кажуць: мужчыны ніколі не плачуць…”***…….53
43. Лацкевіч Яўген Сяргеевіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Беларускія краявіды***...............................................54
44. Красоўская Паліна Арцёмаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Родная зямля***……………………………………55
45. Клімава Марыя Алегаўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва” ***Дух раства***…………………………………...56
46. Варапаева Еўфрасіння Мікалаеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***І я табе свой гімн спяваю***……….......58
47. Бондарава Лізавета Сяргееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Родны край, запаведны навекі***..............59
48. Ігнатовіч Яна Дзмітрыеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва” ***Мая малітва***........................................................61
49. Клепчукова Уладзіслава Русланаўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва” ***Кожны з нас ганарыцца***…….............62
50. Касякова Ксенія Аляксееўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Я веру***………...................................................64

51. Янчукевіч Глеб Уладзіслававіч, вучань VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва” ***Поле***……………………………………..65
52. Бондарава Ванда Уладзіміраўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа № 12 г. Магілёва” ***Поле памяці***………66
53. Сідарэнка Яўген Андрэевіч, вучань VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №34 г. Магілёва” ***Ліст да Дзеда Мароза***……………………………67
54. Зайцава Уладзіслава Уладзіміраўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Расінка шчасця***………………………...69
55. Філіпава Яна Валер’еўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***Сапраўдная гісторыя***…………………….........71
56. Герасімчук Ганна Мікалаеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 9 г. Магілёва” ***Не знішчыць мінулае***…………………...73
57. Захарава Маргарыта Аляксееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва” ***Зарапад***…………………………………74
*58.* Казлова Ганна Яўгенаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Маці***………………………………………...75
59. Сафонава Сняжана Сяргееўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Наш гонар***……………......................76
*60.* Любянкова Анастасія Андрэеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Малая радзіма матулі маёй***…………77
61. Трафімовіч Марыя Сяргееўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Зімой***……………...................................79
*62.* Галушкіна Анастасія Ігараўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Родная мова***……………………………80
63. Максімава Дар’я Дзмітрыеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Магілёву***………………......................81
*64.* Казакоў Даніл Віктаравіч, вучань VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва” ***Вайны не жадае ніхто***…………………………..82
65. Шоскіна Марыя Раманаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Бярозка***……….................................................83
*66.* Мартыненка Ганна Віктараўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва” ***Капрызная зіма***……………………………84
67. Голік Таццяна Сяргееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва” ***Гэта мой кут***……………..............................85
68. Хліманкова Ганна Сяргееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Мая зямля***……………………………………86
69. Краўчанка Сафія Ігараўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***“Распаведай мне, хлопец, пра тую вайну…”***….87
*70.* Госцеў Яўгеній Алегавіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва” ***Клятва***………………………………………..88
71. Гур’янава Віта Валянцінаўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Мой Магілёў***……………………………89
*72.* Зарэмская Аляксандра Уладзіміраўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Роднаму гораду***…………………………90
73. Баранава Марыя Андрэеўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва” ***Памяць***……..............................................................92
*74.* Карасёў Андрэй Юр’евіч, вучань X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Рэха вайны***……………………………………93
75. Соп Аляксандра Сяргееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва” ***Таргі***……....................................................................95
*76.* Сушко Вольга Аляксееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Я дзякую***………………………………………97

77. Мысава Алеся Алегаўна, вучаніца ХІ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 4 г. Магілёва” ***Штодзень чакаю цябе ў парку***……………………..................98
*78.* Клімава Валерыя Вітальеўна, вучаніца ІХ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Ганаруся Радзімай***………………………………..99
79. Пунцэль Ульяна Валер’еўна, вучаніца ХІ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва” ***Думкі***………………...............................................101
*80.* Румянцаў Павел Аляксандравіч, вучань ХІ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Над роднай зямлёй***………………………………102
81. Кудрашова Дар’я Ігараўна, вучаніца ІХ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Спражэнне***………………..................................103
*82.* Кашанкоў Дзяніс Сяргеевіч, вучань ХІ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***Караткевічу***………………………………………105
83. Карпенка Ірына Аляксееўна, вучаніца ІХ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Пад мірным небам***………..................................107
*84.* Гушчык Дар’я Генадзьеўна, вучаніца ХІ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Сустрэча з матуляй***……………………………109
85. Масейкіна Анастасія Русланаўна, вучаніца ІХ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Памяць***………………........................110
*86.* Токарава Аліна Андрэеўна, вучаніца ІХ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Мой родны горад***…………………………………112
87. Дуброўскі Данііл Анатольевіч, вучань ХІ класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва” ***Асенняя завея***………………...............................114

## *Мы – беларуская сям`я!*

*Тата, маці, Насця, я – беларуская сям`я!*
*Разам мы жывём багата,*
*Весялосці поўна хата.*
*Любім мы хадзіць у госці*
*І сяброў к сабе запросім.*
*Пачастуем мы іх кавай,*
*Пагуляем у гульні жвава.*
*Летам ходзім мы ў паходы,*
*Узімку водзім карагоды…*
*Так жа, як адпачываць,*
*Мы ўмеем працаваць.*
*Едзем у вёску да бабулі,*
*Там збіраем мы цыбулю,*
*Потым выцягнем мы моркву,*
*Адкапаем рэдзькі горку.*
*Урукахусё кіпіць –*
*Працавітым трэба быць!*
*Вось такая ў нас сям`я –*
*Беларуская!*

*Барыхаў Павел Раманавіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 45 г. Магілёва”*

## *Бусел, Васілёк, Алеся ды Лянок*

*Па квяцістым росным лузе*
*Ходзіць важны белы Бусел.*
*Сустракае ён сяброў,*
*З імі спрэчку распавёў:*
*«Адгадайце вы, малечы,*
*Хто ў свеце самы лепшы?»*
*Ім адказвае Лянок:*
*«З мяне белы кужалёк.*
*З мяне белыя кашулі*
*Апранаюць прыгажуні.*
*Самы сіні я на лузе –*
*Сімвал герба Беларусі».*
*«Не, напышлівы Лянок! -*
*З ім спрачаўся Васілёк.-*
*Я на ручніках, абрусах*
*Ды на ўсім вялікім лузе*
*Сярод усіх рамонкаў белых*
*Вылучаюся памерам.*
*Пра мяне ў сшытку белым*
*Пішуць вершы піянеры!»*
*«Не!– адказвае ім Бусел.-*
*Птушка – сімвал Беларусі!*
*Берраг свой я аблятаю,*
*Жабак розных паганяю.*
*Усе глядзяць, як я лунаю*
*Над вялікім родным краем».*
*Падышла да іх Алеся*
*З беларускага Палесся,*
*Прыпыніла спрэчку ўраз:*

*«Усе вы лепшыя ў нас!*
*Шчасце вы нясеце нам!*
*Вас нікому не аддам!»*

*Аскірка Алеся Вячаславаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва”*

*Доўга мы зіму чакалі,*
*У вокны з ранку пагдядалі,*
*Зімку-зімачку гукалі –*
*Слёзкі горка пралівалі.*

*Можа, хто пакрыўдзіў зі́му?*
*Ці дарогай заблудзіла?*
*Паляцела не туды?*
*Трэба вызваляць з бяды?*

*Можа, разбудзіць забылі?*
*Спіць у снежнай калыбелі?*
*Ці гуляе ў тэлефоне*
*З летам на сваім "Айфоне"?*

*Упрыгожылі мы клас,*
*Каб зіма прыйшла да нас!*
*Мы развесілі сняжынкі,*
*Выразанкі і карцінкі.*

*Хай зіма да нас спяшае,*
*Снегам землю пакрывае,*
*Хай стварае хараство –*
*На парозе ўжо Раство!*

*Бязмен Іна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва"*

*Памяць аб вайне*
*Адгарэлі даўно папялішчы*
*Самай страшнай, крывавай вайны…*
*Але нельга ніяк нам забыцца*
*Пра ўсіх тых, што з яе не прыйшлі.*
*Пра салдата, што мёрз на балоце,*
*Што ў акопе сядзеў у бары.*
*Пра таго, хто ўставаў па трывозе,*
*Хто ад кулі застыў у той пары.*
*Пра матуль, што сыночкаў чакалі,*
*Пасівеўшы ад думак сваіх.*
*Пра дзяцей, што фашысты знішчалі,*
*Пра надзеі застацца ў жывых.*
*Праз гады нам забыць немагчыма*
*Пра ахвяры Айчыннай вайны,*
*Пра каханне да нашай Радзімы,*
*Што да нас данясці вы змаглі.*
*Няхай памяць увысь узмітнецца,*
*Каб пазналі на роднай зямлі:*
*Мы ўдзячныя вам за дзяцінства,*
*Што не ведае жахаў вайны!*

*Баранкова Дзіяна Андрэеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"*

## *Снег на Каляды*

*Дзеці  смяюцца, дарослыя рады:*
*Снег выпаў нарэшце уначы, на Каляды!*
*У сэрцах ён свята адразу стварыў*
*І дзіўную казку ўсім падарыў.*

*Доўга чакалі зімой, каб сняжынкі*
*Праз  шэрыя хмары прабілі сцяжынкі.*
*Што за цуд божы! Што за краса!*
*Імі любуюцца воўк і ліса.*

*Сняжынак белыя далоні*
*З нябёсаў падаюць на скроні,*
*На вусны, шчокі, вейкі, плечы.*
*Няма куды ад іх уцекчы.*

*Як навагодні падарунак*
*І самы смачны пачастунак*
*На смак спрабуе кожны снег.*
*Ужо відаць і санак бег…*

*У ноч святога Нараджэння*
*Зямля знайшла сабе адзенне.*
*Якое дзіва, хараство!*
*Снег выпаў ноччу, на Раство!*

*Грыгор'ева Анастасія Уладзіміраўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва"*

*Віхрам снег кружыцца,*
*Вее над зямлёй.*
*Дзед Мароз імчыцца*
*З белай барадой.*

*Ён гасцінцы дзецям*
*Розныя прынёс.*
*Снегу шмат насыпаў,*
*Гурбачкі натрос.*

*Дзеці ўзялі санкі*
*І хутчэй з гары!*
*Лепшай няма ў свеце*
*Для малых пары.*

*Бабрэнка Цімафей Віктаравіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва”*

## *Мая Беларусь*

*Твае люблю прасторы*
*І болей нічые:*
*Лясы, палі, азёры*
*Ў снежнай белізне.*

*Замёрзлая рачулка*
*Ільдзінкамі блішчыць.*
*Ад інею красуня -*
*Бярозка зіхаціць.*

*А елачка насупраць*
*У хмызняку густым*
*Стаіць, нібы Снягурачка,*
*У футры снегавым.*

*Не трэба мне чужая,*
*Далёкая зямля,*
*Калі ёсць дарагая*
*Беларусь мая!*

*Траццякова Ганна Аляксандраўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская*
*гарадская гімназія № 1”*

## ***Родны кут***

*Родны кут – мая Радзіма!*
*Да чаго ж ты сэрцу міла.*
*У сэрцы маім працвітаеш*
*І заўсёды дапамагаеш.*

*Вось поле, кветкі, лес і рэчка -*
*Тут ўсё маё: і луг, і кожнае мястэчка,*
*І сонца свеціць у акенца,*
*І лепш нічога няма ў сэрцы.*

*Я тут жыву. Тут мая хата.*
*І сябрукоў у мяне багата.*
*Заўсёды "Дзякуй" гавару,*
*Бо родны кут я свой люблю!*

*Маісеева Дар'я Андрэеўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва"*

## ***Родная мова***

*Мая любая родная мова!*
*У кожным слове – любоў і цяпло.*
*Ласкай вее ад кожнага слова.*
*Вымаўляю – і бачу святло.*

*Мне з дзяцінства казала матуля:*
*“Слова роднае не забывай!”*
*Гаварыла мне і бабуля:*
*“Род шануй свой і паважай!”*

*Вось цяпер я ў школе вучуся,*
*Вельмі радую сваю сям’ю.*
*Але больш за ўсё ганаруся,*
*Тым, што беларускую мову люблю!*

*Журбенка Лізавета Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *У лес*

*Я ў лес іду з бабуляй*
*Летнім ранкам па расе.*
*Сад і рэчка, луг і поле*
*Зіхацяць ва ўсёй красе.*

*У небе сонейка смяецца,*
*Птушкі весела пяюць.*
*Ветрык з краскамі жартуе*
*І цалуе ўсю зямлю.*

*Вось і лес – ён дом чароўны*
*Вабіць водарам грыбным.*
*Тут жыве народ працоўны –*
*Птушкі, мурашы, звяры.*

*Салодка пахне медуніца,*
*У траве схаваўся вож,*
*А духмяныя суніцы*
*Так і просяцца  ў кош.*

*Расціянава Дар`я Аляксееўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва"*

## *Урокі тэатра*

*Мы ў школе - незвычайны клас,*
*Такімі нават лічаць нас.*
*І ён адзіны ў нас пакуль.*
*Але карысць яго адтуль.*
*Каб былі мы ў мастацтве «докі»,*
*У нас бываюць тэатральныя ўрокі.*
*Мы іх старанна вывучаем*
*І пра тэатр шмат чаго мы знаем.*
*Хто для тэатра піша тэксты,*
*Што значыць міміка і жэсты,*
*Нашто тэатру рэжысёр,*
*І білецёр, і кантралёр?*
*Што значыць занавес,гастролі.*
*І як ужывацца трэба ў ролі.*
*Хай мы акцёрамі не будзем,*
*Урокаў гэтых не забудзем:*
*Яны культуру прывіваюць,*
*Патрэбных ведаў дабаўляюць.*
*Праз ўсё жыццё іх пранясём*
*І школу нашу мы не падвядзём!*

*Атчэская Аляксандра Аляксандраўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"*

## *Да людзей*

*Людзі, шануйце роднае слова,*
*Бо гэта – нашай Айчыны аснова!*
*Людзі, каштуйце шчасця імгненні,*
*Нібыта яркага сонца прамені!*

*Людзі, мірнае неба цаніце!*
*І войны закончацца ўміг на планеце!*
*Не забывайце смак роднай зямлі,*
*Бо нарадзіліся беларусамі мы!*

*І паважайце старасць заўсёды:*
*І ў нядзелю, і ў непагоду!*
*Людзі, час добрае справы настаў!*
*Пара пераходзіць да пэўных спраў!*

*Шэўчык Міхаіл Аляксеевіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва"*

## *Мой Магілёў, любоў мая!*

*Майму сэрцу дарагі стаіць горад на Дняпры.*
*Калі глянеш з вышыні, усюды ззяюць купалы.*
*Тут вуліцы шырокія з гісторыяй сваёй,*
*Паркі і праспекты – прыгожы горад мой!*

*Традыцыі шануе мой горад з году ў год:*
*Канцэрты, рэканструкцыі і святаў карагод,*
*Дзе дзеці і дарослыя ўдзел прымаюць зноў.*
*Гандлёвы і культурны горад Магілёў!*

*Спорту час нямалы тут людзі аддаюць.*
*Баітава, Мянькова да Алімпу нас вядуць.*
*Спартыўныя палацы і ўлетку, і зімой*
*Рыхтуюць чэмпіёнаў – спартыўны горад мой!*

*Губернатар з мэрам сочаць тут за тым,*
*Каб у горадзе жылося людзям добра ўсім.*
*Заводы працавалі, і буйна колас рос,*
*Усіх каб шанавалі , адзнакаў быў узрост.*

*Жыві, мой горад Магілёў! Квітней жа з году ў год!*
*Прымай гасцей! Расці дзяцей! Сучаснасці дай ход!*
*Табе хай песні ўсе пяюць, як гэта раблю я.*
*Цябе ўслаўляю, Магілёў, бо ты любоў мая!*

*Васількоў Аляксандр Сяргеевіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва”*

## *Мая сям'я*

*Мая сям`я -  мая апора,*
*Праходзіць міма нашай хаты гора.*
*Гасцей мы любім сустракаць*
*І святы розныя ўсе разам ладкаваць.*

*Наш тата – майстар на ўсе рукі,*
*З ім разам не пазнаем скукі.*
*Веласіпед і змей, вандроўка, шашлыкі*
*І шмат іных падзей.*

*Матуля з намі дома разам,*
*Мы слухаем яе наказы,*
*Параіць нам і дапаможа,*
*Навучыць запраўляць свой ложак.*

*Мікіта – я – старэйшы брат,*
*Сям`і вялікай нашай рад.*
*Усім быць разам нам не сумна,*
*Хоць ў хаце і бывае тлумна.*

*Сярэдні брат мой – Мікалай,*
*Заўжды ў машынкі з ім гуляю.*
*Ён вучыць са мной разам вершы,*
*Наогул, Коля – самы лепшы.*

*Сястрычка наша – Пелагея.*
*Пайшла хадзіць – ужо падзея.*
*Затым пачала размаўляць,*
*Таксама вершы паўтараць.*

*Мая вялікая сям`я!*
*Быць разам з ей так шчаслiў я!*
*Любіце свае сем`і і шануйце!*
*І з роднымі ніколі не сумуйце.*

*Карпечанка Мікіта Сяргеевіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 45г. Магілёва"*

## Мой радавод

Па заданню цэлы год
вывучалі радавод.
Ну а потым не часіну
Малявалі мы карціну.
Дзед Антось і баба Лена…
Аж да сёмага калена
ўспаміналі сваякоў
і радню аж з двух вякоў!
Размясцілі па парадку
сваякоў, як мае быць.
Прыглядзеліся з устатку –
дрэва лісцямі шуміць.
Ад прабабкі Васіліны
род пачаўся той старынны.
А ад бабіных дзяцей
ён пайшоў яшчэ хутчэй.
Там Алёны, Агрыпіны,
Мар'і, Зосі, Акуліны,
дзве Настассі, Аляксей,
цётка Вольга і Андрэй.
Ну а далей -  дзядзькі, цёткі.
Аж не верыцца вачам,
што за гэты час кароткі
такі скарб адкрыўся нам!

*Старыкава Марыя Мікалаеўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва”*

## *Дарагія ветэраны!*

*Нашы дарагія ветэраны!*
*Я віншую з перамогай вас!*
*Да зямлі хачу вам пакланіцца,*
*Дзякую за мір у гэты час!*

*Я жадаю моцнага здароўя,*
*Шмат гадоў шчаслівага жыцця,*
*За яго вы заплацілі кроўю –*
*Многіх ужо не вернеш з небыцця…*

*Хай над вамі неба будзе чыстым,*
*Промні сонца радасць прынясуць.*
*Кожны раз, не толькі ў дзень урачысты,*
*Усе да вас з павагаю ідуць!*

*Казлоў Раман Уладзіміравіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

## *Ты чуеш, гучна льецца слова?*

*Беларуская мова –*
*Зямлі роднай напеў,*
*Сэрцам слухай таемныя гукі.*
*Мова родная –*
*Гэта казачны спеў,*
*Што дзяды табе далі ў рукі.*
*Гучыць у спевах салаўя,*
*Ва ўзмахах крылаў матылька,*
*Звініць у лесе паміж хвой,*
*Бяжыць у рацэ разам з вадой.*
*Яна блішчыць вясной з маланкай,*
*Яна ў сэрцы з калыханкай,*
*Яна ў матчынай любові,*
*Яна ў кожным маім слове.*
*Сваёй я мовай ганаруся!*
*Ёй з усім светам падзялюся!*

*Кузьміна Ксенія Сяргееўна,*
*вучаніца IVкласа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская*
*гарадская гімназія № 1”*

## *Беларусь*

*Бацькоўскі край, бары, палеткі,*
*Блакітных рэчак глыбіня.*
*Духмяныя ўвесну кветкі,*
*Душы народная чысціня.*

*Я – беларус, я ганаруся,*
*Што нарадзіўся тут і ўзрос.*
*У краіне светлай і чароўнай,*
*У краіне казачных дзівос.*

*Зямля бацькоў, зямля святая,*
*Мая краіна Беларусь!*
*Табе я сэрцам прысягаю,*
*Любові шчырай не зракусь!*

*Папкова Вольга Анатольеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва”*

## *У госці да бабулі*

*Я сумую па бабулі.*
*А жыве яна ў вёсцы.*
*Гэта татава матуля.*
*Едзем да яе ў госці.*

*Яе хата ля рачулкі,*
*Побач лес, там ягад шмат,*
*Там грыбы, спяваюць птушкі,*
*Водар кветак. Гэта скарб!*

*У агародзе ў бабулі*
*Садавіны шмат!*
*Спеюць яблыкі і грушы,*
*І агрэст, і вінаград!*

*Розным колерам пылае*
*Перад хатай палісад!*
*Водар кветак заклікае*
*За нектарам пчол у сад!*

*З падарункамі мы едзем*
*Да бабулі ў хату.*
*Ну, бабуля, сустракай,*
*Будзем піць гарбату!*

*Панчанкава Варвара Сяргееўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва”*

## На беразе Дняпра

*Куточак ёсць у Беларусі.*
*Ён для мяне ўсіх радней.*
*Тут хваля даганяе хвалю,*
*Бягуць па рэчцы, хто хутчэй.*
*Бягуць, бы малыя дзіцяткі,*
*Што ўцяклі ад роднай маткі.*
*Як бацька на дзяцей з дакорам,*
*На іх глядзіць Дняпро суровы.*
*На беразе Дняпра тут Вежа*
*Стаіць ужо каторы век.*
*Яе гісторыю, пакуты*
*Не забывае чалавек.*
*Яна ёсць сімвал Магілёва.*
*Яго аснова і герой.*
*Стаіць на беразе дняпровым*
*Суровы ўспамін тых дзён.*
*Знішчалі Вежу і палілі,*
*Але не згінула яна.*
*Бо жыхары яе ўзнавілі*
*І лёс ёй іншы падарылі.*
*Яна наш сімвал Перамогі.*
*К ёй нас вядуць усе дарогі.*
*Дарогі шчасця, захаплення*
*І радасць першага натхнення.*

*Юрчанка Марыя Паўлаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва”*

## Зямля мая

*Я бачу дзіўныя пейзажы,*
*Сярод якіх з маленства я жыву.*
*Сваю краіну я люблю, як маці,*
*Ніколі я яе не падману!*

*Я бачу, як красуюць кветкі ў  полі,*
*Я адчуваю водар каласоў.*
*Я бачу шмат буслоў у небе вольным,*
*Смакую прахалоду ад лясоў.*

*Я ведаю тут кожную іглiцу,*
*Прыродны гук, птушыны спеў.*
*Я бачу, як срабрыстай стужкай уецца*
*Даліна прыгажэйшай з рэк.*

*Усё гэта – ёсць мая краіна!*
*Усё гэта – ёсць мая зямля!*
*Я ўдзячны табе, родная, за тое,*
*Што ты мяне расціла, берагла.*

*Зайцаў Аляксандр Ільіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва”*

## *Мудрая старасць*

*Даўным - даўно ў дзікім свеце*
*Закон бесчалавечны існаваў:*
*Усім бацькам старым у лесе*
*Навекі - вечныя пакуты ён даваў.*

*У дзікім краі жыў Ігнат –*
*Прыхільнік жорсткага закону.*
*Гатоў ён хворых усіх прагнаць*
*У пушчу, каб не чуць іх стогну.*

*Старога бацьку ў лес высокі*
*Чарга прыйшла Пятру вязці…*
*Сабраўся сын у свет далёкі,*
*Бо выхаду, лічыў ён, не знайсці.*

*Прывёз. Але не змог пакінуць…*
*Прынёс дамоў, Закон пераступіў…*
*Прыйшлося бацьку быццам бы загінуць,*
*Але на самай справе ў каморы тата жыў.*

*Паспела ў полі залатое жыта,*
*Але бяда – з’явіўся жорсткі Велікан.*
*Ён замак на асіне збудаваў адкрыта,*
*Людзей з’ядаў, хапаў, як ураган.*

*Нямоглы бацька вырашыў праблему:*
*Сіроткам наказаў: “Вы плачце ўсе мацней,*
*Бо слёзы – сіла, яны рушаць сцены!” –*
*Паслухалі старога – і пала цытадэль.*

*Але ваду Ігнат стаў каламуціць,*
*Ён злы, бяздушны чалавек,*
*І сэрца ён не мае, мусіць,*
*Хацеў з нямоглых здзекавацца век.*

*Бесчалавечнага Ігната - зладзюгана,*
*Прагнаў з сяла пакутлівы народ,*
*Пачвара каб жыццём быў пакараны,*
*А людзі шанавалі, бераглі свой род.*

*Маменчыкаў Дзяніс Міхайлавіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 8 г. Магілёва"*

## *Роздум*

*Дзе хочацца жыць?*
*Дзе лепей тварыць?*
*Як трэба кахаць?*
*Аб чым песні спяваць?*
*Якой праўдай існаваць?*
*На мове якой размаўляць?*

*Жыць трэба на роднай зямлі,*
*Дзе дзяды і прадзеды твае раслі!*

*На мове роднай размаўляць.*
*Слова беларускае шанаваць, не забываць!*

*Аб краі родным песні спяваць.*
*Прыроду яго, прыгажосць усхваляць!*

*Нашых хлапцоў-беларусаў кахаць,*
*Бацькоў паважаць, дзяцей нараджаць!*

*Трэба жыццё сваё так будаваць,*
*Каб людзям не сорам у твар пазіраць!*

*У нашай Беларусі добра жыць!*
*На яе карысць будзем мы тварыць!*

*Рагоўская Анастасія Юр'еўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 9 г. Магілёва"*

## *Гимн вясне*

*Адкуль зямлі цвіценне?*
*Адкуль красы зіхценне?*
*Вясна зямлю ўкрыла.*
*Зіма хмурынкай сплыла.*

*Палеткі жыць пачалі,*
*І травы, быццам кралі,*
*На баль жыцця прыйшлі*
*І шчасце тут знайшлі.*

*Падснежнік міла глянуў,*
*І вожык сон прагнаў.*
*Рабінка, бы дзяўчынка,*
*На голлі – ціш-касынка.*

*Ручэй званчэй скакаў,*
*Каменьчык удаль кідаў.*
*А бераг сонца цешыла,*
*Як маці сына песціла.*

*Машчынская Анастасія Аляксандраўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва"*

## *Давай пагуляем у вайну*

*-Давай пагуляем у вайну,-*
*Хлопчык падбег да дзядулі.*
*Малы не зразумеў, чаму*
*Боль і адчай у вачах мільганулі.*
*- Вайна, даражэнькі мой, не гульня, -*
*Хрыпла сказаў дзядуля. –*
*Загінула ў гэтай навале радня*
*Мая і тваёй бабулі.*
*Вайна – гэта гора, слёзы і жах,*
*Гэта боль, абмыты кроўю салдат.*
*75 год мы не бачым той страх!*
*75 год мы не чуем набат!*
*Большага шчасця ў жыцці не бывае,*
*Калі мірнае неба цябе сустракае!*
*Не трэба, мой мілы, гуляць у вайну,*
*Давай пагуляем у другую гульню!*
*Хлопчык маўчаў і ўважліва слухаў,*
*Свой аўтамат ён рукою сціскаў,*
*Вакол шмат было розных гукаў,*
*Але для хлопчыка толькі голас дзеда гучаў.*
*-Дзядуля, калі я стану дарослым,*
*То ў армію абавязкова пайду!*
*Сваю Радзіму і сваіх родных*
*Ад усіх ворагаў абараню.*
*Мірнае сонца павінна ззяць на планеце,*
*Слёзы толькі ад радасці быць.*
*Аўтамат для мяне цяпер смецце!*
*Жадаю ўсім у міры і шчасці жыць!*

*Біндасава Марыя Аляксандраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва”*

## *Ля магілы невядомага салдата*

*Схілім нізка галовы,*
*Памаўчым у журбе*
*І букецік вясновы*
*Пакладзём мы табе.*

*Колькі Вас невядомых*
*Туліць маці-зямля?!*
*Ды не ведаюць дома,*
*Дзе магіла твая.*

*Бараніў ты Радзіму,*
*Быў звычайны салдат,*
*За яе і  загінуў*
*Чыйсьці бацька ці брат.*

*А чакала ж сыночка*
*Доўга маці з вайны,*
*Пра яго цёмнай ночкай*
*Усё сніліся сны.*

*І вайна адшугала,*
*Праляцелі гады,*
*А яна ўсё чакала*
*Свайго сына й тады.*

*На дарогу глядзела:*
*"Хто ідзе? Мо сынок?"*
*Ліхаманіла цела*
*І туманіла зрок.*

*Маці старанькай стала,*
*Ды да самай труны*
*Усё сыночка чакала*
*З той далёкай вайны.*

*Схілім нізка галовы,*
*Памаўчым у журбе*
*І букецік вясновы*
*Пакладзём мы табе.*

*Сітнікава Паліна Андрэеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва”*

**Мая памяць**

*Мой прадзед ляжыць пад Берлінам,*
*Гадоў ужо семдзясят пяць.*
*А час пралятае няспынна,*
*Ды толькі наш боль не суняць.*

*Застаўся адзін фотаздымак –*
*Там прадзед зусім малады.*
*Сям'ю сваю ў весцы пакінуў –*
*На фронт адыходзіў тады.*

*Дзяцей застолося сямёра*
*У жонкі адной на руках.*
*Нямала ж зведалі гора,*
*Цярпелі пакуты і жах!*

*Як хату фашысты спалілі –*
*Хаваліся ўсе ў паграбні.*
*Ды бульбу гнілую варылі*
*У тыя галодныя дні.*

*А хутка мой дзед нарадзіўся –*
*Вайна гадавала яго.*
*І толькі на здымку дзівіўся*
*На роднага бацьку свайго.*

*Вайна… Незлічоныя страты,*
*Людская нявінная кроў.*
*У кожнай сям'і – свая плата*
*За мір, што для нас надышоў.*

*Ляжыць пад Берлінам мой прадзед,*
*Салдат беларускі ляжыць.*
*А ў сэрцы жыве аб ім памяць,*
*У праўнуках ён будзе жыць.*

*Салют яму дасць Перамога*
*Раскаціцца рэхам “УРА!”…*
*Каб помнілі мы радавога*
*Байца Аляньковa Пятра.*

*Маркава Ганна Уладзіміраўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва”*

## *Родныя словы*

*Родныя словы, родная мова,*
*Для кожнай краіны – гэта аснова.*
*Я нарадзілася ў Беларусі,*
*Роднаю мовай сваёй ганаруся.*
*Сама я па-руску ў жыцці размаўляю,*
*Ды зменіцца час – я сабе ўяўляю-*
*І роднае слова пачне адраджацца,*
*І родная мова пачне абуджацца.*
*Дома, на працы, у класе, у краме*
*Ўсе размаўляць мы аднолькава станем*
*Па-беларуску.*
*І гэта цудоўна!*
*Будзе гучаць усё навокал чароўна!*
*А зараз нам трэба добра вучыцца,*
*Каб мовай сваёй і далей ганарыцца*
*Маглі нашы дзеці праз многа гадоў*
*Ў краіне, дзе ведаюць мову бацькоў.*

*Качанава Ніколь Міхайлаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

## *Найлепшае свята*

*Прысвячаецца Паўлу Ананьевічу Крываносу,*
*Герою Савецкага Саюза, майму прадзеду*

*Шмат розных святаў ёсць на зямлі:*
*Дні нараджэнняў, вяселлі, Каляды…*
*Самы ж чаканы ў нашай сям'і –*
*Дзень Перамогі, найлепшае свята!*

*З самага ранку амаль усе людзі*
*Выходзяць на плошчу, каб потым ракой*
*Хлынуць па вуліцы, галоўнай у горадзе,*
*І ўсім падарыць свой шчаслівы настрой.*

*Шчаслівыя ўсе, бо наша краіна*
*Пакутаў вайны добра ведае жах.*
*Таму мы шануем той мір непарушны,*
*Які здабываўся ў жорсткіх баях.*

*І сёння ў нашых радах побач з намі –*
*Кім ганаруся, каго я люблю.*
*Няхай хоць з партрэтаў сваімі вачамі*
*Глядзяць на свабодную нашу зямлю.*

*З майго фотаздымка юнак пазірае.*
*Каб не сорак чацвёрты, быў бы прадзедам мне.*
*А зараз у Алеі Славы чакае –*
*Героем ён стаў у Айчыннай вайне.*

*Я кветкі яму прынясу – мне так трэба-*
*У жыцці Паўлу кветак ніхто не дарыў.*

*За шчасце, за мір, за свабоднае неба,*
*За тое ўсё, што для нас ён здабыў!*

*Кучароўская Александрына Андрэеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 21 г. Магілёва”*

## *Дзіцячыя забавы*

*Прыйшла зімка. Нам надоўга*
*Падарыла лёд і снег,*
*Гульні, святы і прыгоды,*
*І дзіцячы гучны смех.*

*Раз – сняжынка, два – сняжынка –*
*Атрымаецца сняжок.*
*Клічуць санкі і лядзянка:*
*-Выхадзі гуляць, дружок!*
*На лыжню, на горку пойдзем,*
*Гуртам з’ездзім на каток.*
*Ланцужком звязаўшы сані,*
*Весела зляцім у сумёт.*

*Нагуляцца - часу мала:*
*Рана наступае змрок.*
*І дзіцячыя забавы*
*Сціхнуць зноў на вечарок…*

*Гузаў Аляксандр Вітальевіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “НПК яслі-сад-сярэдняя школа №44 г.Магілева”*

## *Снегавік*

*Я зляпіў снегавіка.*
*Ён-у бокі кулакі,*
*Дзесьці тоўсты, дзесьці тонкі*
*Крываватыя бакі.*

*Падышоў сусед мой Рома*
*І давай кругі круціць:*
*-Тут патрэбна крыху зрэзаць,*
*А вось тут бы нарасціць.*

*Прыскакалі Танька з Ленкай:*
*-Ой, вось будзе прыгажосць,*
*Калі стане выдавацца*
*Над брывом чырвоны нос.*

*Дзязька Фёдар, дворнік наш,*
*Затрымаўся на хвіліну:*
*-Каб закончыць  вобраз ваш,*
*Трэба у рукі хварасціну.*

*І ўсміхнуўся снегавік,*
*Гузікі чарнеюць урад.*
*Будзе радасці да сонца*
*У дарослых  і рабят.*

*Мярзіка Дзмітрый Сяргеевіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа № 42 г. Магілёва"*

## *Фарбы прыроды*

*У прыроды розных фарбаў шмат,*
*Сталі яны побач, быццам на парад.*
*Сіні колер аж здалля, з  нябёс,*
*Спусціўся на рэчку, азёры і плёс.*

*Зялёны ўпрыгожыў лугі і лясы,*
*А жоўты прылёг на пяскі і палі.*
*Чырвоным  гарыць у мароз небасхіл,*
*Фіялетавым золак свой сцеле насціл.*

*Аранжавы ў кветках і садавіне,*
*Блакітны ў небе і ў азярыне.*
*А ўсе яны разам у месцы адзіным*
*У вясёлку зліліся над нашай Радзімай.*

*Рознакаляровых жа ў свеце фарбаў  шмат,*
*Знойдзе іх і стар, і млад.*
*Толькі агляніся, паглядзі зрання,*
*Сонечнай палітрай зіхаціць зямля.*

*Байкачова Грэта Уладзіміраўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 23 г. Магілёва”*

***

*Край беларускі, край мой родны!*
*Блакіт нябёс і рэчак шыр.*
*Ты так да болю мне знаёмы,*
*І ў думках будзеш назаўжды.*
*І ўзімку каля снежнай хаты,*
*Дзе не змаўкаў вясёлы смех,*
*І каля рэчкі, дзе заўзята*
*Дзіцячых санак бачыў бег.*
*Вясенняй ранняю зарою*
*Птушыны не змаўкае спеў.*
*І ў квецені садоў духмяных*
*Лагодны ветрык праляцеў.*
*Прывабна летняю парою*
*Прайсці па лесе ўсцяж бяроз.*
*І ты заўважыш, як прыемна*
*Табе засвеціць сінь нябёс.*
*Ужо і восень на парозе,*
*Нам не чуваць птушыны спеў.*
*І толькі золатам заносіць*
*У садзе голле старых дрэў.*
*І ўсе святыя краявіды,*
*Што засталіся ад бацькоў,*
*Мы беражэм іх, як малітву,*
*Вядомую спакон вякоў.*

*Рыбакоў Аляксандр Васільевіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 39 г. Магілёва"*

## *Абуджэнне прыроды*

*Вясною абуджаецца прырода,*
*Вясною нараджаецца жыццё.*
*Адходзіць хутка зімняя самота,*
*І пачынаецца прыроды адкрыццё.*

*Пралескі паяўляюцца ў лагчынах,*
*Глядзіць блакітнымі вачыма сон-трава.*
*Вярбы такая гнуткая галіна*
*Пухнаценькімі камячкамі зацвіла.*

*Ужо і дні даўжэй намнога сталі,*
*Вясёлым звонам раўчукі звіняць.*
*Яны свой звон палям, лугам аддалі,*
*Каб радасцю жыцця хутчэй абняць.*

*Пяшчотаю і цеплынёю сонца лашчыць.*
*Яно нясе нам мір, святло, настрой,*
*Перабірае промнямі і бачыць,*
*Як шчаслівы і рады мы с табой.*

*Вясна – жыцця пачатак, свет і адкрыццё.*
*Вясна – шчаслівы час прылёту птушак,*
*Пачатак новых спраў, жыцця быццё,*
*Дзіцячых гульняў, мар, аб блізкім леце думак!*

*Долбун Арцём Паўлавіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва"*

## *Мама-педагог*

*У мяне з матуляй*
*Выдатныя адносіны,*
*Але парой турбуюць*
*Мяне яе паводзіны.*

*Жанчына ва ўзросце,*
*Ужо за трыццаць год,*
*А часта прызнаецца:*
*"Іду вучыць урок".*

*Бяжыць штодзень у школу,*
*Партфель з сабой бярэ.*
*Пра сшыткі і падручнікі*
*Размовы ўсё вядзе.*

*Сядзіць у кожным класе*
*Яна па колькі год.*
*Гэта мая мама –*
*Мама-педагог.*

*Бубнова Паліна Уладзіміраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 27 г. Магілёва"*

## *Маё сэрца заўсёды з табою*

*Многа дзён я ў краіне далёкай,*
*У прыгожых чужых гарадах…*
*Толькі сэрца заўсёды з табою,*
*Дарагая Радзіма мая!*

*Майму воку цяпер не хапае*
*Сакавітай мурожнай травы,*
*Стужак рэк, што імкнуцца ў далі,*
*І лугоў, дзе цурчаць ручаі.*

*Спеваў птушак і ціхага ззяння*
*Вечаровай чароўнай красы,*
*І часіны ад ночы да рання,*
*Мёдам пахнуць калі верасы.*

*Я люблю твае чыстыя далі*
*І буслоў несціханы палёт.*
*Шум лясоў, журавоў клекатанне*
*І блакіт васільковых палёў…*

*І з краіны далёкай, прыгожай*
*Я імкнуся ў росны твой свет.*
*Для мяне ўсіх багаццяў каштоўней*
*Твой някідкі рабінавы цвет.*

*Шчадракова Уладзіслава Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва"*

## *Танец*

*Ішлі ў танцы дзве бярозкі,*
*Ім вецер песціў голле-коскі.*
*Стары высокі дуб  магутны*
*Стаяў чамусьці вельмі сумны*
*І ўсё не мог ніяк рашыць:*
*Каго ж на танец запрасіць?*
*Убаку стаяла адна ліпка,*
*Ёй пасавала жоўта світка.*
*А малады чароўны клён*
*Ёй слаў лістом сваім паклон.*
*Плыла мелодыя над краем,*
*І здаўся міг той нейкім раем,*
*Дзе панавала ўсюды скрозь*
*У фарбах, гуках прыгажосць.*

*Лаўрова Паліна Андрэеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 2 г. Магілёва”*

## *Зімовы настрой*

*У класе сёння не сядзіцца –*
*І знік настрой у мяне вучыцца;*
*Сусед мой побач усё ўздыхае,*
*На вокны галавой ківае.*

*А там сняжынак рой пчаліны*
*Снуецца, быццам пух птушыны.*
*Знікае ўсюды від маркотны,*
*Кладуцца белыя палотны.*

*Настаўнік строга побач ходзіць,*
*Па тэме гутарку заводзіць.*
*Ды як жа тут за розум брацца?*
*Калі так прагне разгуляцца!*

*Вось перапынак. Не ўтрываеш:*
*Рукзак дзе-небудзь пакідаеш,*
*Бяжыш на двор, крычыш, гукаеш,*
*Зіму з сябрамі сустракаеш!*

*Пухоўскі Яраслаў Дзмітрыевіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва”*

## *Мая Радзіма*

*Тут нарадзілася, жыву,*
*Сябрую, у школу тут хаджу,*
*Тут нарадзіліся бацькі,*
*Мае знаёмыя, сябры.*

*Тут кожны кут мне сэрцу мілы,*
*І нават іншыя краіны*
*Хай будуць лепшыя ў сто раз,*
*Скажу з павагаю да вас,*

*Што ты, Радзіма дарагая,*
*Мне сэрцу мілая, радная.*
*З табою разам назаўсёды*
*Мы пераможам усе няўзгоды!*

*Ключнікава Ангеліна Андрэеўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва"*

## *Я веру, мова – будзе жыць*

*Нам трэба ведаць нашу мову,*
*Каштоўнасць спасцігаць яе,*
*Не даць загінуць родным словам,*
*Бо тады згубім мы сябе.*

*Яна як скарб, што нам належыць.*
*Нам выбіраць шляхі свае.*
*І не яна ад нас залежыць,*
*А мы залежым ад яе.*

*Хай мова наша не збяднее,*
*Хай звонка, як крышталь, звініць,*
*Цяплом сваім усіх сагрэе.*
*Я веру, мова – будзе жыць!*

*Кавалёў Руслан Дзмітрыевіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 11 г. Магілёва”*

## *Родная мова*

*Родная мова маёй Беларусі!*
*Праз годы нясеш ты пяшчоту сваю.*
*Табою, любімая, я ганаруся,*
*Аддаены душою, і славу пяю.*

*Ліешся ў песнях свабоднаю птушкай*
*У старых паданнях праз сэрцы людзей.*
*Калі б што ні сталася, непарушна*
*Цаніць цябе буду – няма мовы радней.*

*У гуках тваіх водар цёплага хлеба,*
*Жытнёвага поля, лясоў і лугоў.*
*Усмешка блакітнага чыстага неба*
*Да люду свайго, да краіны любоў.*

*Лісіцын Мікіта Аляксандравіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Кажуць: мужчыны ніколі не плачуць…*

*Кажуць: мужчыны ніколі не плачуць…*
*Мужнасць сваю берагуць на гады.*
*Моцнае сэрца, характар пакажуць,*
*А слёзы – ад слабасці і ад нуды.*

*Я так і лічыла, бо мне гаварылі,*
*Што моцнай быць духам – патрэба ўсіх.*
*А летась бацькі таямніцу адкрылі*
*Пра воінаў-продкаў – байцоў маладых.*

*У першыя дні той страшэннай навалы*
*Краіну сваю баранілі яны.*
*І Крэпасць геройскаю славай бывалай*
*Месяц трымалі ў пачатку вайны.*

*А летам у крэпасці Брэсцкай героі*
*Адчула ў сэрцы я духу ўзмах.*
*Паверыла ў наша жыццё ў спакоі,*
*Убачыла слёзы бацькоў на вачах.*

*Кажуць: мужчыны ніколі не плачуць… .*
*Татавы слёзы не слёзы слабых!*
*Ёсць радасці слёзы (іх бы ўбачыць).*
*І гонар за продкаў, за родных сваіх!*

*Качагарава Арына Алегаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 21 г. Магілёва”*

## *Беларускія краявіды*

*Аблокі плывуць у высокае неба,*
*Шукаць прыгажэй краявідаў не трэба.*
*Зялёныя травы над ціхай крыніцай,*
*На ўзлеску ў траве чырванеюць суніцы.*

*Вяртаюцца зноў журавы на Палессе,*
*Прыносяць вясну з цудоўнаю песняй.*
*Зноў клічуць сцяжынкі ў высокія далі,*
*Бярозы ды сосны глядзяцца ў хвалі.*

*Прыгожых мясцін на зямлі вельмі многа,*
*Адгукнецца сэрца на шчырыя словы.*
*Азёры, палі і лясы Беларусі –*
*Старонкай сваёй я заўжды ганаруся!*

*Лацкевіч Яўген Сяргеевіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва”*

## *Родная зямля*

*Прыгожы край з блакітнымі вачыма,*
*Палі, лугі і лес, што за ракой.*
*Радзімы кут, ты сэрцу майму мілы,*
*І нават у растанні ты са мной.*

*Паеду я ў далёкую краіну,*
*Дзе не відаць лясоў, лугоў, палёў,*
*Не ўбачу тых азёр, што я пакінуў,*
*Вяночкаў  тых, якія з кветак плёў.*

*Але калісьці зноў сюды вярнуся*
*І песню новую тады я прапяю*
*Пра родныя абсягі Беларусі,*
*Пра слаўную і вольную зямлю.*

*Красоўская Паліна Арцёмаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва”*

## *Дух раства*

*Раство! Раство!*
*Набліжаецца яно.*
*Дух Раства ў нас жыве,*
*Радасць людзям ён нясе.*

*Той сцюдзёнай ноччу*
*Анёл пралятаў,*
*Вестку аб Растве Хрыстовым*
*Людзям перадаў.*

*Вялікую радасць я вам прынёс:*
*У горадзе Віфлееме*
*У пячоры цёмнай*
*Нарадзіўся Хрыстос.*

*Ён з нябёс спусціўся*
*Грэшны ратаваць народ,*
*Святкаваць Раство Хрыстова*
*Будзем кожны год.*

*І новая зорка*
*Ярка так заззяла,*
*На добрыя справы*
*Народ благаслаўляла.*

*Мы Раство святкуем,*
*Славім мы Хрыста,*
*Душы адкрывем*
*Для яго цяпла.*

*Душы мы адкрыем.*
*І, каб аддаць сваё цяпло,*
*У людзей паверым,*
*Што нясуць святло.*

*Мы забудзем крыўды,*
*Прэч прагонім зло,*
*Паселім у свеце*
*Любоў і цяпло.*

*Клімава Марыя Алегаўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва”*

## *І я табе свой гімн спяваю!*

*Кірыліца – табе аснова,*
*Трымалася, расла, мужнела.*
*Вякамі радавала мова*
*І срэбным ручайком звінела.*

*Паэты песні табе склалі.*
*А як яны гучалі, звалі!*
*І тыя песні гімнам сталі,*
*Радзіму нашу праслаўлялі.*

*Гучыць, як быццам водгук ліры,*
*"А краскі ніжай гнуць галовы…",*
*"Мой родны кут, як ты мне мілы…" –*
*Яскравыя якія словы!*

*А я табе свой гімн спяваю,*
*Ты – мова родная, жывая!*
*Я вершы пра цябе складаю,*
*Цябе, як маці паважаю.*

*Варапаева Еўфрасіння Мікалаеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва"*

## *Родны край, запаведны навекі*

*Да 75-годдзя вызвалення Беларусі*
*ад нямецка-фашысціх захопнікаў*

*Родны край, запаведны навекі,*
*Хіба можна цябе не любіць?*
*Зведаў усё ты: і славу, і здзекі.*
*Немагчыма нам гэта забыць.*

*Як герой, ты трымаў абарону*
*На Дняпроўскім сваім рубяжы.*
*Чэрвень… Вораг ірваўся да ўсходу,*
*Ззялі танкаў фашысцкіх крыжы.*

*Неслі смерць ўдзень і ўноч самалёты -*
*Векапомных тых дзён не забыць.*
*Памагалі Дняпроўскія воды*
*Палкіх ворагаў хутка сцюдзіць.*

*І падбітыя танкі з гарматаў*
*Бачыў Сіманаў як ваенкор.*
*Магілёў, ты тады зведаў славу*
*І захопнікам стаў як дакор.*

*Нібы гулкае рэха блукае*
*Па мясцінах мінулых баёў,*
*Быццам нехта нябачны шукае,*
*Хто з далёкай вайны не прыйшоў.*

*Сотні жаўранкаў песні спяваюць,*
*У нябыт адлятаюць гады…*

*І бязлітасны час пахавае*
*Ліхалецця былога сляды!*

*Сёння ўстаў над ракою шырокай,*
*Перамогу святкуеш ты ў май,*
*Варты славы, павагі бясконцай,*
*Запаведны і любы наш край!*

*Бондарава Лізавета Сяргееўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 11 г. Магілёва”*

## *Мая малітва*

*Я прачнулася рана на досвітку…*
*Як спакойна і ціха наўкол!*
*І замерла ад велічы, росквіту*
*Дзіўнай краіны маёй.*

*Край мой – магутны герой –*
*Пераможаным так і не стаў.*
*І ваеннай суровай парой*
*Межы родныя абараняў.*

*Не скарыўся, не стаў на калены,*
*Не зміры ўся з прыгнётам чужым.*
*Здолеў ён зберагчы родны сцены,*
*Адрадзіцца і стаць зноў буйным.*

*Шчасце – жыць у мірнай краіне,*
*Бачыць усмешкі старых і дзяцей,*
*Разумець, што ніхто не загіне*
*Сярод многіх мільёнаў людзей.*

*Я малюся ўсім сэрцам да бога,*
*Каб спакой панаваў на зямлі,*
*І пытанні, якіх вельмі многа,*
*Вырашыць словам (не куляй) маглі.*

*Каб вайна не прыйшла на палеткі,*
*Не пасеяла роспач і гора,*
*Не таптала прыгожыя кветкі*
*І з крыві не стварала бы мора.*

*Я хачу, каб заўсёды павольна*
*Бусел у небе блакітным лунаў,*
*Як і зараз, паважна, спакойна*
*На зямлю з вышыні пазлядаў.*

*Ігнатовіч Яна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва”*

## *Кожны з нас ганарыцца…*

*Кожны з нас ганарыцца сям'ёй,*
*Кожны з нас ганарыцца зямлёй,*
*Краінай, Радзімай, Айчынай,*
*Блакітнай, зялёнай … шчаслівай!*
*Ўсё добра, калі за вокнамі мір*
*І родныя побач, на дрэве снягір.*
*Але ў гісторыі былі часы:*
*Чырвонымі сталі кроплі расы.*
*Вораг прыйшоў - і кожны трэці*
*Пайшоў у лапы страшэннай смерці:*
*Кожная хата, кожны куток,*
*кожная вёска і гарадок…*
*Змагаліся супраць фашысцкага гада,*
*І перамозе ўсе былі рады.*
*Уся Беларусь спадзявалася: мір,*
*Змагалася, колькі хапала сіл.*
*Доўгія, цяжкія, галодныя леты…*
*Ад іх засталося адно толькі рэха…*
*Ніхто не жадае іх успамінаць,*
*Ніхто не жадае іх паўтараць.*
*Наша зямля - гэта наша краіна,*
*Прыгожая, моцная, светлая, мірная.*
*І мы абяцаем, што мір зберажом,*
*Бабулі і дзеду прысягу даём!*

*Клепчукова Уладзіслава Русланаўна,*
*вучаніцаVIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва"*

## *Я веру*

*Вайна –гэта гора,*
*Вайна - гэта мукі,*
*Вайна – гэта страты*
*І годы разлукі.*
*Вайна – гэта монстар,*
*Бязлітасны, дзікі,*
*Іклы яго востры,*
*Укусы шматлікі.*
*Ляціць над зямлёй ён,*
*Пускае пажары,*
*Зганяе ў палон*
*І дзяцей, і цяжарных.*
*Старых, абяздоленых*
*Душыць пачвара,*
*Калечыць іх душы,*
*Калечыць іх твары.*
*Хто выдумаў гора?*
*Хто выдумаў мукі?*
*Хто выдумаў страты*
*І годы разлукі?*
*Адкуль прылятае*
*Страшэнны і люты,*
*Навошта прыносіць*
*Народам пакуты?*
*Я веру: наступіць*
*Вясна на планеце,*
*Усцешацца людзі,*
*Усцешацца дзеці!*

*Касякова Ксенія Аляксееўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва”*

## *Поле*

*– Што такое поле? –*
*Спытаў у дзеда я. –*
*Ці цуд яно якое?*
*Ці простая зямля?*
*Дзед адказаў мне шчыра,*
*У вочы зазірнуў,*
*Святлом дабра і міру*
*Мяне ён прыцягнуў:*
*Вось ніва залаціцца,*
*Найлепш не ўбачыш ты.*
*Нам ёсць чым ганарыцца,*
*Стаяць снапоў гурты.*
*А ёсць другое поле,*
*Ляжыць каля Дняпра,*
*Не ўбачыш ў наваколлі*
*Ніводнага двара.*
*Замест аўса і жыта,*
*Што там расці маглі,*
*Асколкі мін, снарадаў*
*У зямлі той заляглі.*
*Гэрэлі "тыгры" на полі,*
*"Пантэры", матацыклеты.*
*Байцы змагаліся за волю,*
*І Сіманаў ўсё бачыў гэта.*
*Дзед змоўк, уздыхнуў,*
*Мяне абняў за плечы…*
*Аднекуль бусел успырхнуў,*
*Над полем апусціўся вечар.*

*Янчукевіч Глеб Уладзіслававіч,*
*вучань VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 19 г. Магілёва"*

## *Поле памяці*

*Стаіць капліца ў чыстым полі.*
*Стаіць не так ужо даўно.*
*Пастаўлена людской рукою*
*Для памяці, не для кіно.*

*Паліта гэта поле кроўю*
*Тых, хто ў мінулую вайну*
*Закрыў наш Магілёў сабою,*
*Закрыў Смаленск, закрыў Маскву.*

*А сёння, пад сырой зямлёю,*
*Ляжаць астанкі тых байцоў,*
*Хто лёс аддаў за нас з табою.*
*Магільны груд – іх вечны кроў.*

*Ідуць дажджы ці свеціць сонца.*
*Выюць мяцелі ці вятры.*
*Байцам тым з поля не вярнуцца.*
*Нам жыць за іх… Нам жыць за іх…*

*Гарыць ціхонечка лампадка,*
*Даніна памяці жывых.*
*А тым салдатам толькі й трэба,*
*Каб людзі помнілі пра іх.*

*Бондарава Ванда Уладзіміраўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа № 12 г. Магілёва"*

## *Ліст да Дзеда Мароза*

*Добры дзень, шаноўны дружа!*
*Маг, штукар і чарадзей!*
*Уладар зімовай сцюжы,*
*Снегу, холаду, завей!*

*Ліст табе пішу, шаноўны,*
*Добры, любы Дзед Мароз!*
*Ты на Новы год галоўны,*
*І нам з поўначы прынёс*

*Зіхаценне зорак дзіўных,*
*Свету месяца з нябёс,*
*Па ўсіх сцежках і далінах*
*Быццам пацерак натрос.*

*Я ж, хлапчына-васьмікласнік,*
*Шмат дарункаў не прашу.*
*Буду вельмі табе ўдзячны,*
*Калі здзейсніш, што хачу.*

*Ты маёй матульцы любай*
*Са свайго мяшка дастань*
*Утульнасць дома, выгляд юны*
*І здароўе цераз край.*

*Думаю, што і для таты*
*Адшукаеш без затрат*
*У мяшку сваім багатым*
*Падарункаў ты зашмат.*

*Будзе хай на сэрцы лёгка,*
*Песні хай у душы гучаць,*
*Быццам навагодняя хай ёлка,*
*Яго ўсмешкі зіхацяць!*

*І мяне сваёй увагай,*
*Дзед Мароз, не абміні.*
*Каб вучыўся добра ў школе,*
*У завеі белай папрасі.*

*Сідарэнка Яўген Андрэевіч,*
*вучань VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва"*

## *Расінка шчасця*

*– Што з табою, мілы хлопча? –*
*Дзед пытае ціха-ціха.*
*– Што задумаўся, маўчыш,*
*Як бярозка? Нешта сніш?*

*– Не, – адказвае малы.*
*На шчацэ – расінка шчасця.*
*А ў душы – сляды вайны:*
*Холад, смутак, цень нянасця…*

*– Ты не думай пра благое.*
*То прайшло, сышло навек.*
*Сонца-светач ззяе ў небе,*
*А зямлю цалуе смех.*

*Рэха дзён халодных, цёмных*
*Не вярнецца. Ты мне вер.*
*І бярозкі ліст зялёны*
*Будзе жыць, не знаць завей.*

*Зберажы расінку шчасця*
*І бярозку пад акном,*
*Каб жыццё цвіло, напасці*
*Не пяклі зямлю агнём!*

*Хлопец ведае здаўна:*
*Мір, пануе цішыня.*
*Дзякуй Вам, байцы-героі!*
*Кліча заўтра! Ды якое!*

*І з вачэй іскрынкі ярка*
*Азарылі ўсё вакол:*
*– Зберагу расінку шчасця,*
*І  бярозку  пад акном.*

*Зайцава Уладзіслава Уладзіміраўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва”*

## *Сапраўдная гісторыя*

*Восень, холад, дождж і вецер.*
*Каля дома сорак шэсць*
*Сумны, як адзіны ў свеце,*
*Кот сядзеў – густая шэрсць.*

*Як жа тут ты апынуўся?*
*Гаспадар твой дзе і дом?*
*Нехта кажа: "Ён згубіўся,*
*Стаў у падвале жыхаром".*

*Слёз стрымаць тут немагчыма!*
*Як так можа ў свеце быць,*
*Што жывёлу з хаты людзі*
*Могуць узяць ды адпусціць?*

*"Мама, тата, ён жа змерзне*
*Лютай снежнаю зімой.*
*Знойдзем дом кату –*
*Хто-небудзь возьме шэрага дамоў!"*

*Мы аб'яву далі разам*
*Разаслалі на ўвесь свет.*
*Верылі, што добрым часам*
*Дапаможа інтэрнэт*

*І аднойчы нечакана*
*Зазваніў наш тэлефон!*
*"Мы шукалі сябра доўга,*
*Нам патрэбен толькі ён!"*

*Сябар наш пушысты, чысты,*
*У хаце цёплай коўдра, плед.*
*Вочы ззяюць прамяніста,*
*Любіць ён увесь белы свет.*

*Мяккай лапкай дакрануўся*
*Да сардэц усіх людзей.*
*Я жадаю, каб у свеце*
*Да жывёл былі дабрэй.*

*Філіпава Яна Валер'еўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва"*

## *Не знішчыць мінулае*

*У сне чароўным бачыла я месца…*
*Жыццё спачатку можна там пачаць.*
*Там, як у немаўляці, б’ецца сэрца,*
*Душа ірвецца радасцю крычаць.*

*Там ёсць каханне, здрада і надзея.*
*Там ёсць вясна і лета, восень і зіма.*
*Усё там, быццам у рэальнай дзеі,*
*Адна адметнасць: памяці няма.*

*І пад уражаннем імгненнага парыву,*
*Без лішніх роздумаў туды я ўвайшла.*
*І сапраўды, час прошлы раптам згінуў,*
*Але пустэча пеплам на жыццё лягла.*

*Не трэба знішчыць прошлае імкнуцца,*
*Інакш у будучым табе не апынуцца.*

*Герасімчук Ганна Мікалаеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 9 г. Магілёва”*

## *Зарапад*

*Ціхі вечар надыходзіць*
*Хутка цемра, цішыня.*
*Месяц на неба выводзіць*
*Зоркі ў заканчэнні дня.*

*Зоркі стануць у парадак,*
*Вось ужо сузор'яў шмат…*
*Колькі ў небе зноў загадак –*
*Вось, напрыклад, зарапад.*

*Зоркі падаюць чамусьці*
*З роднай вышыні нябёс.*
*Людзям добрых пажаданняў,*
*Мусіць, зарапад прынёс.*

*Пагляджу ў начное неба –*
*Зоркі ўсе пералічу.*
*Зарападу пачакаю –*
*Пажадаю, што хачу!*

*Захарава Маргарыта Аляксееўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва"*

## *Маці*

*Маці, матуля…Родныя словы*
*З самага сэрца нашае мовы.*
*Хто, як матуля, цябе прыгалубіць?*
*Болей, як маці, ніхто нас не любіць.*

*Маміна казка – ноч у спакоі,*
*Маміна песня – радасць і воля,*
*Маміна сэрца заўсёды ў трывозе,*
*Маміны думкі з намі ў дарозе!*

*Маміны вочы над намі, як зоры,*
*Аберагаюць ад болю і гора.*
*Маміна ўсмешка – сонца ласкавае,*
*Мама на свеце лепшая самая!*

*Казлова Ганна Яўгенаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва”*

## *Наш гонар*

*Натхненнем і паэзіяй сагрэты,*
*Агеньчыкамі бесядзянскай хвалі…*
*Шляхі-прасторы ўсяго Сусвету*
*Глыбіннай плынню ў вершах загучалі!*
*О так, паэт! І мужны, і сапраўдны,*
*Народа сын, Радзімы абаронца!*
*Абвешчаны вялікім знаўцам праўды,*
*Рашучы, справядлівы, шчыры творца!*
*І вось на паўмільярдным кіламетры*
*Стагоддзі мы душою адчуваем.*
*Лятуць гады, страчаем часу нетры,*
*Адвечныя ўсе ісціны прымаем.*
*Вясна, жыццё – чытаем усё нанова,*

*Сафонава Сняжана Сяргееўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва”*

## *Малая радзіма матулі маёй*

*Малая радзіма мамы маёй*
*Здаецца з дзяцінства мясцінкай сваёй.*
*Якая ж яна, старонка мая,*
*Бабулі, дзядулі, матулі зямля?!*

*Нічога дзіўнога, здаецца, няма.*
*Лугамі, лясамі чаруе сама.*
*Прасторы, узгоркі, лагчынкі,*
*Шырокі гасцінец, малыя сцяжынкі…*

*Вёска на трасе Бабруйск – Магілёў,*
*Віецца дарога між шырокіх палёў.*
*Усцяж магістралі прысады бяроз,*
*Па полі канаўкі з карункамі лоз.*

*Бярозкі садзіла прабабуля мая.*
*Канавы капалі, каб сохла зямля.*
*Няма ўжо на свеце прабабкі маёй,*
*Алея ж бярозак здаецца сваёй.*

*Грэза-рачулка цячэ недалёка,*
*Вёска ж мая на ўзгорку высока.*
*Сажалка ёсць, азярцо неглыбокае,*
*Неба заўсёды, па мне, тут высокае.*

*Вёска была на людзей тут багата,*
*Сёння ж пустая вясковая хата.*
*Вельмі спакойна, прыгожа, чароўна…*
*Пойдзеш у лес – грыбоў, ягадак поўна.*

*Свежа і ціха на рэчцы імклівай,*
*Выцягнеш рыбінку – станеш шчаслівай.*
*А недалёка сады ўсцяж калгасныя.*
*Яблынек, грушак радочкі выразныя.*

*Дзед за парадкам у садочку сачыў.*
*Дзень Першамая заўсёды тут быў.*
*Матулька шануе старонку сваю,*
*Цэніць і любіць, і я ж працягну!..*

*Любянкова Анастасія Андрэеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва"*

## *Зімой*

*У родны край прыйшла зіма,*
*З сабой прынесла снег, марозы.*
*Пакрыла інеем яна*
*Рабіны, клёны і бярозы.*
*Засыпаў снег усё вакол,*
*У полі стала пуста, глуха.*
*А ў лесе, як галодны воўк,*
*Гудзе і вые завіруха.*
*Нібы чырвоныя шары,*
*Якія свецяцца здалёку,*
*Сядзяць на дрэвах снегіры*
*І радуюць людское вока.*
*А дзеці не зважаюць на мароз,*
*Гуляюць весела ў снежкі,*
*Хоць шчыплецца мароз да слёз,*
*На тварах свецяцца ўсмешкі.*

*Трафімовіч Марыя Сяргееўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

## *Родная мова*

*Гук за гукам – вось і словы,*
*Што складаюць нашу мову.*
*Мова ж лашчыць і чаруе,*
*Грэе сэрца і хвалюе.*

*Чыстым голасам спявае,*
*Раны гоіць і натхняе.*
*І звініць, што ручаёчак,*
*Як ласкавы той званочак.*

*Мова ззяе, што вясёлка!*
*Што рабіны кідкай гронка,*
*Што матуліна ўсмешка,*
*Так ласкае напрадвесні.*

*Ганаруся роднай мовай!*
*І народам! І зямлёю!*
*Не знайсці іх прыгажэй*
*Майму сэрцу даражэй.*

*Галушкіна Анастасія Ігараўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 40 г. Магілёва”*

## *Магілёву*

*Горад старажытны, сінявокі,*
*Легендарны і святы.*
*Тут бяжыць Дняпро шырокі*
*З-пад высокае гары.*
*Тут дзівоснымі садамі*
*Вуліц поўніцца прастор.*
*Зіхатлівымі агнямі*
*Сустракае кожны двор.*
*Ты – наш сімвал гераізму!*
*Колькі доблесных сыноў*
*Страціў у барацьбе з фашызмам,*
*Наш герой – родны Магілёў!*
*Горад выстаяў у часе*
*Ліхалеццяў і нягод.*
*А падняў цябе з руінаў*
*Працавіты наш народ.*
*Хутка зноў ты ажывіўся*
*І палепшыў воблік свой.*
*Як той фенікс, адрадзіўся*
*І цяпер стаіш сцяной*
*Над нашай будучыняй светлай,*
*Над гісторыяй усёй.*
*Для мяне – заўсёды лепшы,*
*Ззяеш у сэрцы цеплынёй.*
*Дык жыві і развівайся,*
*Горад-казка над Дняпром.*
*Толькі ў кветкі ўбірайся,*
*Будзь шчаслівы, родны дом!*

*Максімава Дар'я Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва"*

## *Вайны не жадае ніхто*

*Вайны не жадае ніхто на планеце:*
*Ні нашы бацькі, ні малыя дзеці!*
*Адкуль жа ўзялася такая навала,*
*Што нашу Радзіму калісь напаткала?*

*Шчасце, сям’я, дзяцінства, каханне…*
*Ўсё гэта было – засталося расстанне…*
*Крычаць фотаздымкі: “Не рушце жыццё!*
*Яно ад матулі ўсім нам дано!”*

*Прайшло семдзесят пяць гадоў,*
*Але ведаю я,*
*Як плакала горка краіна мая.*

*Матуля – Радзіма, Матуля – Зямля!*
*Клянуся, што Я - абарона твая!*

**Казакоў Даніл Віктаравіч,**
вучань VIII класа
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва”*

## *Бярозка*

*Бярозка адзінокая мая,*
*Стаіш, як сіраціна, каля хаты.*
*Сустрэць імкнуся я цябе здаля*
*І сваякоў убачыць вельмі рады.*

*Мне часта снішся па начах*
*У горадзе шумлівым, неспакойным.*
*Стаіш ты, адзінокая, у вачах,*
*А я сумую па куточку родным.*

*Мясціны мілыя, спяшаюся да вас*
*У кожную свабодную часіну.*
*Бярозка белая махае мне падчас,*
*Калі прыеду на сваю радзіму.*

*Чакай, прыеду да цябе,*
*Сустрэнь мяне зялёнаю лістотай.*
*Куточак родны вабіць да сябе,*
*Я да яго імкнуся ўсёй душою.*

*Шоскіна Марыя Раманаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"*

## *Капрызная зіма*

*Дзе ж наш снег?*
*Дзе ён блукае?*
*І чаму не прылятае?*
*Снег з лістотай размаўляў*
*І вядома запаздаў.*
*Хутка,хутка ён вярнецца,*
*Ляжа роўна на палі,*
*Лёдам ён пакрые рэкі,*
*Будзе бела на зямлі.*
*Будзе добра і прыгожа,*
*Будуць санкі і канькі,*
*Будзе холад і марозы,*
*Снег,сняжок,хутчэй прыйдзі!*

*Мартыненка Ганна Віктараўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва”*

## *Гэта мой кут*

*Бярозы, рабіны*
*Уздоўж каляін,*
*І нівы, дзе колас*
*Схіліўся да глебы…*

*Кашлатыя елкі,*
*Палянкі суніц,*
*Празрыстыя росы,*
*Блакітнае неба…*

*Азёры глыбокія,*
*Шчыры народ,*
*Мой бацька і маці*
*Працуюць на славу.*

*Я тут нарадзілася,*
*І гэта мой кут.*
*Усім сваім сэрцам*
*Яму я аддана!*

*Голік Таццяна Сяргееўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва”*

## *Мая зямля*

*Мы дзецi мацi- Беларусi,*
*Мы дзецi мацеркi- Зямлi!*
*Нiколi сэрцам не зракуся*
*Я роднай матчынай зямлi!*
*Мне любы мiлыя палеткi,*
*Рачулкi, пушчы i бары,*
*I ўсе куточкi i мястэчкi*
*Чароўнай, казачнай зямлi.*
*Душа мая належыць Мiнску,*
*А ў сэрцы Магiлёў жыве!*
*Мне Полацк ноччу ў сны прыходзiць,*
*А Вiцебск песняю заве.*
*I колькi буду жыць на свеце*
*Любоў у сэрцы пранясу.*
*I перадам я сваiм дзецям,*
*Як шчыра я цябе люблю – Мая ЗЯМЛЯ!*

Хлiманкова Ганна Сяргееўна,
вучанiца VII класа
*дзяржаўнай установы адукацыi "Сярэдняя школа № 32 г. Магiлёва"*

## *Распаведай мне, хлопец, пра тую вайну…*

*Ты глядзіш з фотаздымка прыгожы такі,*
*Пасталелы, а погляд юнацкі, жывы.*
*Ветэран той далёкай, жахлівай вайны–*
*Прадзед мой, пераможца і воін былы.*

*Не дажыў да майго нараджэння, не змог*
*Распаведаць мне прадзед  пра тую вайну.*
*Да Берліна дайшоў –у зямельку не злёг*
*І ніколі не плакаў пра долю сваю.*

*Партызанам пачаў ён свой шлях у вайну,*
*Ваяваць давялося  ў гвардзейскім палку,*
*Хлопец цвёрда зажаў кулямёт у руку,*
*З перамогай прайшоў праз Еўропу ўсю.*

*Я не плачу пра тых, хто дзяцінства не меў,*
*Перамогі вялікай ім песні пяю.*
*Фотаздымак прадзедаў  я ў рукі вазьму,*
*Ганарліва па горадзе ў свята прайду.*

*Краўчанка Сафія Ігараўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва”*

## *Клятва*

*Перамога. Свята. Май.*
*Сіні-сіні небакрай.*
*Пераможцам шлём прывет.*
*Сярод іх быў мой прадзед.*
*Ён у сямнаццаць стаў салдатам,*
*Многа раз хадзіў у атаку,*
*І вярнуўся ён дамоў*
*З Перамогаю, герой.*
*Потым сеяў, хлеб расціў,*
*Чытаць сына навучыў.*
*Марыў сто гадоў пражыць.*
*Унукаў-праўнукаў любіць…*
*Ціхком зноў вайна падкралась –*
*Міна ў полі разарвалась…*
*Сіратою рос мой дзед.*
*Захаваў для нас партрэт.*
*Я гляджу на фоташдымак,*
*Паўтараю без запінак:*
*"Помнім, дзед, дзеля чаго*
*Ты аддаў жыццё сваё.*
*Ліхалецце адвядзём,*
*Зямлю нашу зберажом!*
*І няхай на ўсёй планеце*
*Будзе мір, смяюцца дзеці!"*
*Перамога. Свята. Май.*
*Сіні-сіні небакрай.*
*Пераможцам шлём прывет.*
*Сярод іх быў мой прадзед!*

*Госцеў Яўгеній Алегавіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 34 г. Магілёва"*

## *Мой Магілёў*

*Мой родны куточак мяне захапляе,*
*Гісторыяй, мовай на творчасць натхняе.*
*Я Магілёвам сваім ганаруся,*
*З яго дабрыні, прыгажосці дзіўлюся.*

*Дзіўлюся з паданняў, і казак, і вершаў,*
*Са светлых вясновых праменьчыкаў першых.*
*З цудоўнай вясёлкі, цікавай і чыстай,*
*З расінкі, іскрыстай і шчырай, празрыстай.*

*Празрыстай надзеяй усе зоры спяваюць,*
*Святла і дабра Магілёву жадаюць.*
*Ласкавае сонейка нас саграваае,*
*Пяшчотаю цёплай заўсёды вітае!*

*Вітае струменьчыкі нашай Крыніцы*
*І дзіўныя гукі з высокай званіцы,*
*Якія гучаць на ўсё Падміколле,*
*Дзе думкам – душэўны спакой і раздолле!*

*Раздолле жыцця, маладосці, кахання –*
*Усіх абдымае шчаслівае ранне!*
*І мірнае неба над горадам родным,*
*Над краем славутым і мужным, свабодным!*

*Свабодным напевам гучаць нашы песні!*
*Іх птушкі прынеслі з сабой напрадвесні…*
*З усмешкай буслоў Магілёў сустракае…*
*Мой родны куточак мяне захапляе!..*

*Гур'янава Віта Валянцінаўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва"*

## *Роднаму гораду*

*Ты здзіві мяне фарбаў дзівосамі,*
*У футра гукаў душу агарні.*
*Пацалункамі зорнымі, роснымі*
*Маё сэрца цяплом абдымі.*

*Я малюю любоў з шэрай раніцы*
*І да захаду доўгага дня…*
*За алоўкам маім думкі цягнуцца,*
*Як да Чорнага мора рака.*

*Мой куточак Зямлі! Я турбуюся,*
*Каб жыццё тваё добрым было,*
*Каб люстэрка Сусвету ўсміхнулася,*
*Гледзячы на тваё хараство.*

*Спрабаванняў табе столькі выпала –*
*Перапоўняць пакут акіян!*
*Усё ты здолеў прайсці, гора вытрымаў*
*І не згінуў ад жудасных ран.*

*Родны мой Магілёў! Хай шчаслівымі*
*Нараджаюцца дзеці твае!*
*Хай на кожнага з іх хопіць шчырасці,*
*Дабрыні і спагады ўдвайне!*

*Я пабачу шмат розных краін, навандруюся.*
*Дзесьці стрэну каханне сваё…*
*Толькі ў снах усё адно: твае вуліцы,*
*Плошчы, скверы, будынкі, святло…*

*Ад сябе не збяжыш, не схаваешся.*
*Мае думкі належаць табе.*
*Я малюю любоў з кожнай раніцы*
*Да пары, пакуль сэрца жыве.*

*Зарэмская Аляксандра Уладзіміраўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва”*

## *Памяць*

*Ідуць гады… Плывуць гады…*
*І як птушкі пралятаюць!*
*Была вайна. Даўно прайшла…*
*А памяць нас у той час вяртае.*
*У тыя страшныя гады,*
*Калі змагаўся люд з навалай,*
*Усе збіраліся ў рады*
*І білі ворага пад вершы Коласа, Купалы.*
*А Магілёў стаяў, як Леў,*
*Ля вёскі Буйнічы трымаў ён абарону.*
*Нам тую бітву Сіманаў апеў,*
*Жывых і мёртвых славячы герояў.*
*Змагаліся паэты-землякі*
*На ўсіх франтах і ў партызанах.*
*І баявыя вершы Пысіна, Кірэенкі*
*Чыталіся ў акопах, а не ў залах!*
*Пісалі вершы, славілі байцоў,*
*І выпускалі партызанскія газеты.*
*Сваім пяром у бой вялі хлапцоў,*
*Пяро, як штык,- вось зброя для паэта!*
*Той грозны час выпрабання дату*
*Нам не забыць, хоць час ідзе наперад,*
*Словы паэтаў-франтавікоў гучаць  набатам,*
*Гартуюць гонар наш і напаўняюць верай.*

*Баранава Марыя Андрэеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 28 г. Магілёва”*

### *Рэха вайны*

*Гады ліхія, як навала,*
*Прайшліся па маёй зямлі,*
*Але ты  выжыла, стрывала*
*У вайной апаленыя дні.*

*Змагаліся разам усе народы*
*За мір, за шчасце, за  спакой.*
*Сабою  закрывалі доты,*
*Ішлі на смерць у няраўны бой.*

*Як многа засталося ў полі*
*Ляжаць на зморанай зямлі.*
*Не захацелі жыць у няволі,*
*Радзіме здрадзіць не змаглі.*

*Дзяды здабылі перамогу,*
*Каб мы ішлі ў славуты шлях,*
*Каб выбралі сабе дарогу:*
*Лячыць, вучыць ці жаць у палях.*

*Ад нас далёка тая дата,*
*Што абвясціла людзям мір.*
*Ад шчасця плакаў, не саромясь,*
*І радавы, і камандзір.*

*А тыя слёзы нашых дзедаў*
*Забыць нам памяць не дае.*
*Яны заўсёды будуць людзям*
*Нагадваць аб  той вайне.*

*Гарматы гучна залпы білі,*
*Узняўся Перамогі сцяг.*
*"Ура" крычалі ў кожнай хаце,*
*І гукі ішлі на ўвесь прасцяг.*

*І тыя гукі рэхам моцным*
*У нашу памяць увайшлі,*
*Каб мы і нашы пакаленні*
*Навекі памяць зберaглі!*

*Карасёў Андрэй Юр'евіч,*
*вучань Х класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва"*

## *Таргі*

*Зімовы вечар. Цішыня.*
*Я баўлю час у інтэрнэце.*
*Гартаю розныя спасылкі:*
*Што дзеецца ў белым свеце?*
*Зайшла на "Куфар" і дзіўлюся:*
*Чаго народ не прадае!?*
*Адзенне, посуд, нават кошкі –*
*Каму чаго не дастае.*
*І раптам бачу: МЕДАЛІ.*
*"За баявую славу", "За адвагу"…*
*І словы "прадаю", "мяняю"*
*Маю прыцягваюць увагу.*
*Што прадаеш ты, чалавек,*
*І што мяняеш?*
*Ён галаву злажыў навек,*
*А ты багацце нажываеш!*
*Хто навучыў цябе, калі*
*Грашамі мераць медалі?*
*І што сказалі бы Карпенкі,*
*Глечыкі і Свісты,*
*Пабачыўшы, як ганарыста*
*Твар свеціцца твой ад здабычы.*
*Баец ішоў за Перамогай,*
*Пад кулі кідаўся, пад танкі, пад гарматы.*
*А ты секундай радасці ўбогай*
*Ацэньваеш свае затраты.*
*Яшчэ не позна: спахапіся!*
*Зірні ў вочы тым,*
*Што засталіся*

*Жывымі.*
*Мала іх.*
*З гадамі шансаў менш і менш*
*Ім пакланіцца.*
*Нам імі трэба ганарыцца,*
*А не наладжваць таргі*
*Сумлення, памяці, павагі.*
*Замест бесчалавечнае знявагі*
*Часцей заглядвайце на куфар у душы.*

*Соп Аляксандра Сяргееўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва”*

## *Я дзякую*

*Я дзякую табе, славуты наш зямляк,*
*Народжаны зямлёй дрыгавічоў учора,*
*За вернасць лёсу палачан,*
*За повязь крэўную з сям'ёю.*
*Я дзякую табе, удумлівы пясняр,*
*Спавіты беларускасцю бясконцай,*
*За матчын спеў, за бацькаў дар,*
*За мілаванне мовай роднай.*
*Я дзякую табе, няўрымслівы змагар,*
*Упэўнены, прадбачлівы і смелы,*
*За вольнасць мар, за сэрца жар,*
*За еднасць ісціны і веры.*
*Я дзякую табе, прасветлены прарок,*
*Непадуладны чарам-хмарам,*
*За веру ў новых вёснаў крок,*
*За гонар незалежным  краем.*
*Я дзякую табе, узнёслы наш мастак,*
*З душой дзіця і стрыжнем князя,*
*За "Каласы…" – дабра працяг,*
*За гімн любві чазеніі на скалах…*
*Я дзякую табе, вялікі Чалавек,*
*За шлях твой, мужны і шчаслівы!*
*За смак быцця, за песень лек,*
*За любасць да жыцця Айчыны!*
*Я дзякую табе, бясконцы Чалавек!*
*Я дзякую табе навек!*

*Сушко Вольга Аляксееўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва"*

***

*Штодзень чакаю цябе ў парку,*
*І восень наступае зноў.*
*А я сяджу, гляджу на лаўку,*
*Дзе мы спаткаліся з табой.*

*Гляджу на стары фотаздымак*
*І ўспамінаю тыя дні,*
*Калі ўвосень, у гэтым парку*
*Ад вечара і зноў да ранку*
*Цвілі кахання нашы мары,*
*Плылі кахання нашы дні.*

*Але аднойчы не прыйшоў ты…*
*Мабыць, забыўся пра мяне?..*
*Але ж ты ведай, што ад ранку*
*Чакаю я цябе ў парку,*
*І восень наступае зноў…*

*Мысава Алеся Алегаўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія № 4 г. Магілёва"*

## *Ганаруся Радзімай*

*Я ганаруся маёй Радзімай,*
*У свеце лепшай, у душы адзінай,*
*Прыгожай, моцнай і свабоднай,*
*Для добрага жыцця, для шчасця годнай.*

*Я ганаруся лепшымі сынамі,*
*Хто жыў раней, хто побач з намі*
*Стварае славу роднае зямлі.*
*У нашай памяці застануцца яны.*

*Францыск Скарына і Адам Міцкевіч,*
*Янка Купала, Казімір Малевіч,*
*Жарэс Алфераў, Домрачава Даша –*
*Яны ды іншыя – пашана наша!*

*Я ганаруся са слязамі на вачах*
*Людзьмі, што вытрымалі боль і жах,*
*Падчас вайны гарой стаялі за Айчыну,*
*Смуткую аб ўсіх, хто без пары загінуў.*

*Ад куль варожых злёг у полі*
*Ці быў закатаваны ў няволі,*
*Аб мірных жыхарах Хатыні,*
*Аб вёсачках, што сталі ўспамінам…*

*Сучаснаю краінай ганаруся*
*І нізка ў ногі пакланюся*
*Будаўніку, настаўніку і хлебаробу,*
*Што твораць людзям на спадобу.*

*Я ганаруся краявідамі прыроды,*
*Што радуюць нам вока год ад году,*
*Буслоў лунаннем вольным у нябёсах,*
*Адзіным з Беларуссю лёсам!*

*Клімава Валерыя Вітальеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва"*

## *Думкі*

*Маленства. Дзяцінства. Юнацтва.*
*Жыцця пралятаюць гады.*
*Здаецца ўчора радзіўся,*
*А вось першакласнік ужо ты.*
*Праз дзесяць гадоў - ты дарослы.*
*І будзеш трымаць ужо адказ*
*За тое, што здзейсніш, што мусіш…*
*І гэта ўсур'ёз, а не фарс.*
*Здаецца, у школе нас вучаць,*
*Як гора-бяду абмінаць…*
*Аднак будзеш ты, а не іншы*
*Жыццёвую сцежку таптаць.*
*Як хочацца нам, каб адразу*
*Была яна гладкай, прамой.*
*Таму шлём у неба заказы,*
*Каб лёс прадказаў астраном.*
*А трэба паверыць у сілы,*
*У веды, што ўклалі ў нас.*
*І здзейсніцца мара, магчыма,*
*Вяршыні пакарацца ўраз.*

*Пунцэль Ульяна Валер'еўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва"*

## *Над роднай зямлёй*

*Над роднай зямлёй*
*Ласкавейшае сонца.*
*Над мілай старонкай*
*Яснейшае неба.*
*Я нашаму краю*
*Удзячны бясконца.*
*Мне земляў чужых*
*І багаццяў не трэба.*
*Мне б толькі да белых*
*Бяроз прытуліцца.*
*Падыхаць празрыстым*
*Паветрам гаючым.*
*Чысцюткай вадзіцы*
*З крыніцы напіцца.*
*За родны свой край*
*Паміраць не балюча.*

*Румянцаў Павел Аляксандравіч,*
*вучань XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

**Спражэнне**

Мне кажуць : "Яна памерла".
Гавораць, што нежывая…
А я з дзеясловам "верыць"
Сябрую і ўголас спрагаю.

Я веру, што мова продкаў
Не згіне праз нейкі час.
Мы верым, што словам родным
Паўсюды сустрэнуць нас.

Як раўчукі напрадвесні
Сцяжынкай цякуць напрамкі,
У душу беларускае песні,
Мой дружа, павер і ты!

Пакуль разважаюць па звычцы,
Што мовы маёй не існуе,
Я зноў, як ваду крынічную,
Словы па кроплі смакую.

Суніцы, зязюля, прыгоды,
Тата, матуля, чабор…
Сплятаюцца словы родныя
У просты прыгожы ўзор,

Што ткалы рукою матчынай
Для дзетак і родных сваіх.
У продкаў, Радзіму , спадчыну,
Скажыце, верыце вы ?

*Гучыць хай мова Купалы*
*На вуліцы, дома, у школе,*
*У дзіцячым садку, у трамваі,*
*Запоўніць сабой наваколле!*

*І ў гэтым вольным прасторы*
*Слухай, як мова бруіцца!*
*З гэтай крыніцы моўнай*
*Кожны хай наталіцца!*

*Кудрашова Дар'я Ігараўна,*
*вучаніца ІХ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва"*

## *Караткевічу*

*Яго жыццё, яго паветра,*
*Яго душа і яго кроў,*
*Дзве сотні тысяч кіламетраў –*
*І гэта ўсё – яго любоў.*

*І гэта ўсё яго Радзіма:*
*Мінск, Орша, Брэст і Рагачоў.*
*Ён стаў вядомым яе сынам,*
*Адным з выдатнейшых сыноў.*

*Вось тут прайшло яго дзяцінства.*
*На гэтым месцы пасталеў,*
*Пазнаў з краінаю адзінства*
*І старасць тут жа ён сустрэў.*

*Лісты каштанаў пад нагамі,*
*І пад сярпом тут каласы.*
*Нават і Стаха паляванне*
*Здолеў убачыць добры сын.*

*Паміж нямых братоў размову*
*Пачуў Уладзімір у цішы.*
*І роздум свой пра родну мову*
*Аддаў паперы шырыні.*

*Бліны на дрэве ён убачыў,*
*З вярбы ён грушы спрабаваў.*
*За барвяным шчытом схаваўшысь,*
*Птушыны суд ён назіраў.*

*Сустрэўшы з Быхава дзяўчыну,*
*Былое полымя ў грудзях*
*Адчуў, і вогнішча рабіны*
*Адлюстравалася ў вачах.*

*Аддаўшы душу Ёй – Радзіме,*
*Застаўся ён з ёй да канца,*
*Пад небам нашым светла-сінім*
*Не страціцца імя творца.*


*Кашанкоў Дзяніс Сяргеевіч,*
*вучань XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 5 г. Магілёва"*

## *Пад мірным небам*

*Ці еду я гасцінцам бойкім,*
*Ці іду дарогаю лясной,*
*Наўкол плыве блакіт бясконцы,*
*Пануе расць і спакой.*

*Я чую, як клякоча бусел,*
*Зязюля цешыць варажбой…*
*Іду адна і не баюся*
*Гуляць па сцежцы палявой.*

*Мне летам сонца лашчыць рукі,*
*Зімой сняжынкі абдымаюць,*
*Вясною цешаць птушак гукі,*
*Увосень клёны сум здымаюць.*

*Штодзень імкнуся я вучыцца,*
*Каб болей ведаў атрымаць.*
*І ў вольны час мне не сядзіцца –*
*Магу як след адпачываць.*

*Бо мой народ тры часткі веку*
*Жыве ў краіне без вайны.*
*І не трывожаць чалавека*
*Начамі жудасныя сны,*

*Як смерць прымаў народ магутны,*
*Цярпеў і здзекі, і прымус,*
*Як знік з зямелькі шматпакутнай*
*Аж кожны трэці беларус.*

*Як гінулі ад куль варожых,*
*Не вынеслі галодных дзён...*
*А колькі на лугах і пожнях*
*Лягло герояў без імён…*

*Краіны іншай мне не трэба,*
*Тут кожны пах - душэўны лек.*
*Бо я жыву пад мірным небам*
*І я – шчаслівы чалавек!*

*Карпенка Ірына Аляксееўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва”*

## *Сустрэча з матуляй*

*Ты прыходзіш у сне да мяне, мая любая мама.*
*Свеціш цёплым праменем вясёлай усмешкі сваёй.*
*Ты ласкаеш мяне і галубіш пяшчотай таксама,*
*Прытуляеш да сэрца, як некалі ранняй вясной.*

*Я смяюся, тваёй дабрынёй абласканая,*
*Гладжу хворыя рукі такія худыя твае*
*І не веру, што толькі ў сне ты такая чаканая.*
*Толькі ў сне ты галубіш, люляеш і песціш мяне.*

*Як нялёгка ў жыцці больш не чуць дзіўнай мамінай мовы.*
*Цяжка з сэрца мне вырваць той чорны і жудасны дзень*
*І адчуць, зразумець, што ніколі-ніколі мае ўжо словы*
*Не паклічуць, не вернуць цябе ці хоць толькі твой цень.*

*А цяпер, як заўжды, мне патрэбна тваё выхаванне,*
*Як знайсці, выбраць правільны шлях у нялёгкім жыцці,*
*Дзе вучыцца далей, не баяцца як мне хвалявання,*
*Чалавекам як стаць і сцяжыну сваю дзе знайсці?*

*Ты вярніся ў сне да мяне, мая птушка-красуня.*
*Прыляці, каб з табой мне пабыць хоць разок.*
*Прыплыві да мяне ты , мая дарагая матуля,*
*Хоць у думках наведай свой родны і мілы куток…*

*Гушчык Дар'я Генадзьеўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва"*

## *Памяць*

*Над краінаю сонца ўздымаецца ранкам,*
*Разам з ім новы дзень сустракаем і мы.*
*Сінь нябёсаў, цудоўныя спевы заранкі,*
*След расы на траве, над ракой туманы.*

*Мне красы Беларусі заўжды будзе мала.*
*Хай яна застаецца свабоднай ад бед!*
*І ўявіць зараз страшна, якая навала*
*У сорак першым тады ахапіла ўвесь свет.*

*Чарната, мо чарней нават колеру ночы,*
*Стрэлы, крыкі, пажарышчы, попел і дым.*
*Бы шалёнай пачварай, вайна лезла ў вочы,*
*Успамін каб пакінуць пра ліхія гады.*

*Разрываліся міны, грымелі снарады,*
*І атрады ішлі ўсё адзін за адным.*
*І ваенны, і ўрач, ткач, настаўнік, важаты –*
*Кожны трэці ішоў паміраць маладым.*

*Аддавалі жыццё мужна, смела, рашуча,*
*Паказалі нашчадкам, як Радзіму любіць,*
*Маяком Перамогі праз цярністыя кручы*
*Неслі словы свабоды: "Беларусь будзе жыць!"*

*І жыве яна, наша матуля-Радзіма,*
*Лашчыць сонейкам цёплым сваіх жыхароў.*
*А нашчадкі-сыны помняць кожнае імя*
*Абаронцаў, чыя пралівалася кроў.*

*Узвышаюцца скрозь тут і там абеліскі –*
*Гэта вечная памяць у сэрцы зямлі.*
*І паклон назаўжды абаронцам тым нізкі*
*За свабоду і волю, што нам прыняслі!*

*Масейкіна Анастасія Русланаўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва”*

## *Мой родны горад*

*Мая маленькая радзіма,*
*Мой родны горад Магілёў!*
*У садзе кволая рабіна,*
*І шум тапаляў над Дняпром.*

*Прыветлівыя магілёўцы*
*І годных храмаў перазвон.*
*Крыжы купаюцца ў сонцы,*
*Званы склікаюць на паклон.*

*Не спіцца ночкай аксамітнай –*
*У хаце вокны расчыню*
*І палячу душой адкрытай*
*У гарадскую цішыню.*

*Вось ратуша мяняе колер,*
*Вось горды Днепр, манастыр,*
*Друкарня, дзе ўладарыў Собаль,*
*Убачыў свет яго "Псалтыр".*

*Ля Параскевінай крыніцы*
*Мы ўсе ачысцімся душой.*
*Сюды прыходзяць памаліцца,*
*Паспрабаваць вады жывой.*

*Святое Буйніцкае поле…*
*Загінуўшых там не злічыць.*
*Яны для нас здабылі волю,*
*Каб мы маглі шчасліва жыць!*

*Мая вялікая Радзіма,*
*Мой слаўны горад Магілёў!*
*Куточак, мне з дзяцінства мілы,*
*Мая зямля, мая любоў*

*Токарава Аліна Андрэеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва"*

## *Асенняя завея*

*Іду па вуліцы. Вецер. Завея.*
*Завея з лісцяў, што падаюць з дрэў.*
*Якія ж думкі мне вецер навее?*
*А ён пра ўсё мне пяе нараспеў!*

*Пяе ён пра тое, што добра на свеце*
*Жыць, думаць, смяяцца і родных любіць!*
*Пяе ён пра шчасце зямное, дзе дзеці,*
*Бы кветкі на лузе, і радасць бурліць!*

*Шапоча асенні мне ветрык на вуха,*
*Як трэба мне маці сваю берагчы,*
*Каб на сталасці год душэўная скруха*
*Не прыйшла да мяне, быў спакой на душы.*

*А яшчэ мне спяваюць дажджынкі ў лісці,*
*Што лепей няма мне Радзімы маёй,*
*Дзе з коласам траўка просяць забрысці*
*У свет беларускай прыроды святой!*

*Шапоча і лісце, шапоча і дожджык,*
*Шапоча і кожны куток дарагі,*
*Што самы каштоўны і мілы куточак*
*Той, дзе ты нарадзіўся! Яго беражы!*

*Адказаць табе, ветрык, я, любы, хачу,*
*Што твой запавет праз жыццё пранясу.*
*Твае ўсе наказы штогодна, штодня*
*Я выканаць мушу як трэба, спаўна.*

*Я буду любіць, я буду кахаць,*
*Я буду ўсім шчасця ў свеце жадаць*
*І вартым імкнуцца быць родных сваіх,*
*Каб твар усміхаўся людзей дарагіх!*

*Дуброўскі Данііл Анатольевіч,*
*вучань XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 34 г. Магілёва”*